## КРАІНА СОВЕТАЎ СВЯТКУЕ ГАДАВІНУ ВЫРАТАВАННЯ ЧЭЛЮСКІНЦАЎ

# ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА ГЕРОІ-ПАЛЯРНІКІ ПРАДАЎЖАЮЦЬ БАРАЦЬБУ ЗА АСВАЕННЕ АРКТЫКІ.



Отто Юльевіч ШМІДТ.
Фотэ В. КУДАЯРАВА (Саюзфото).



Лётчыкі-героі Совецкага Саюза (злева направа): тт. ЛЯПІДЗЕЎСКІ, МОЛАКАЎ, КАМАНІН, СЛЕПНЁЎ, ВАДАП'ЯНАЎ, ДАРОНІН, ЛЕВАНЕЎСКІ.

*Старонкі гісторыі*

## „ЧЭЛЮСКІН“ ЗАТАНУЎ

**Палярнае мора, 14 лютага.** (Перадана па радыё). 13 лютага, у 15 гадз. 30 мін., у 155 мілях ад мыса Паўночнага і ў 144 мілях ад мыса Уэлен «Чэлюскін» затануў, раздушаны ільдамі.

... Звязаліся з радыёстанцыямі Уэлена і мыса Паўночнага, адкуль будзе арганізавана дапамога самалётамі і сабакамі. Настрой ва ўсіх бадзёры.

Запэўняем урад, што ніякі час це не спыніць нас у рабоце па канчатковаму асваенню Арктыкі, пралажэнню Паўночнага морскага шляху.

**Начальнік экспедыцыі ШМІДТ.**

—о—

## ЛАГЕР ЧЭЛЮСКІНЦАЎ, ПАЛЯРНАЕ МОРА, НАЧАЛЬНІКУ ЭКСПЕДЫЦЫІ ШМІДТУ

ШЛЕМ ГЕРОЯМ-ЧЭЛЮСКІНЦАМ ГАРАЧАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ. З ЗАХАПЛЕННЕМ СОЧЫМ ЗА ВАШАЙ ГЕРАІЧНАЙ БАРАЦЬБОЙ СА СТЫХІЯЙ І ПРЫМАЕМ УСЕ МЕРЫ ДА АКАЗАННЯ ВАМ ДАПАМОГІ. УПЭЎНЕНЫ Ў ДОБРЫМ ЗЫХОДЗЕ ВАШАЙ СЛАЎНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ І Ў ТЫМ, ШТО Ў ГІСТОРЫЮ БАРАЦЬБЫ ЗА АРКТЫКУ ВЫ ЎПІШАЦЕ НОВЫЯ СЛАЎНЫЯ СТАРОНКІ.

**СТАЛІН,**
**МОЛАТАЎ,**
**ВАРАШЫЛАЎ,**
**КУЙБЫШЭЎ,**
**ОРДЖАНІКІДЗЕ,**
**КАГАНОВІЧ.**

## У тыя дні

**13 лютага.** У 3 г. 30 м. у 155 мілях ад мыса Паўночнага і ў 144 мілях ад мыса Уэлен «Чэлюскін» затануў, раздушаны ільдамі. Без панікі быў выгружан на лёд даўно падрыхтаваны аварыйны запас. За выключэннем загінуўшага загадчыка гаспадаркай **т. Магілевіча**, экіпаж і члены экспедыцыі ў складзе 104 чалавек зышлі на лёд.

**14 лютага.** Соўнарком СССР паставіў арганізаваць урадавую камісію для аказання дапамогі чэлюскінцам пад старшынствам тав. **В. В. Куйбышэва.**

**15 лютага.** У лагеры Шмідта будуецца барак на 50 чал., для астатніх разбіты палаткі. На Чукотцы мабілізуюцца сабачыя вупражкі.

**18 лютага.** Лётчык тав. **А. Ляпідзеўскі** прадпрыняў першую спробу вылецець у лагер, але вымушан быў вярнуцца ва Уэлен з-за пургі.

**20 лютага.** З СССР у Амерыку выехалі ўпаўнаважаны ўрадавай камісіі тав. **Ушакоў** і лётчыкі тав. **Слепнёў і т. Леванеўскі** для арганізацыі дапамогі чэлюскінцам з боку Аляскі.

**27 лютага.** У лагеры Шмідта атрымана радыёграма таварышоў **Сталіна, Молатава, Варашылава, Куйбышэва, Орджанікідзе, Кагановіча** аб тым, што прымаюцца ўсе меры да аказання дапамогі чэлюскінцам.

...лі кухню і пякарню, захворванняў няма. Харчамі забяспечаны на два месяца. Маральнае становішча па-ранейшаму надзвычай добрае.

**23 сакавіка.** Ледакол «Красін» вышаў у мора на дапамогу экспедыцыі Шмідта.

**25 сакавіка.** Параход «Совет» з двума дырыжаблямі, аэрасанямі і самалётам лётчыка т. **Балотава** вышаў з Владзівастока на поўнач.

**28 сакавіка.** Тт. **Леванеўскі і Слепнёў** з **Ушаковым** і амерыканскімі борт-механікамі **Лаверы і Армістэдам** вылецелі з Фербенкса ў г. Нома-Аляскі на самалётах, закупленых у Амерыцы. Звяно самалётаў т. **Каманіна** вылецелі з Анадыра ў Ванкарэм.

**30 сакавіка.** Лётчык т. **Леванеўскі** вылецеў з Нома. Ля Ванкарэма ён папаў у густы туман, але з выключным майстэрствам і адвагай утрымаў самалёт ад падзення. Пры спуску лётчык быў ранен, астатнія — цэлы.

**1 красавіка.** Лётчык **т. Бабушкін** з механікам тав. **Валавіным** прыляцеў на самалёце «Ш-2» з лагера Шмідта ў Ванкарэм.

**3 красавіка.** Тав. **Слепнёў** прыляцеў з Нома ва Уэлен.

**7 красавіка.** Лётчыкі тт. **Слепнёў, Каманін і Молакаў** пераляцелі з Уэлена ў Ванкарэм і зараз-жа вылецелі ў лагер. Пры пасадцы ў самалёта т. **Слепнёва** пашкоджана шасі. Тт.

## ШТОДЗЕНЬ ПАВЫШАЦЬ КВАЛІФІКАЦЫЮ

*(Гутарка з Героем Совецкага Саюза лётчыкам Н. П. Каманіным)*

Пасля сканчэння работы па выратаванню чэлюскінцаў, слаўную гадавіну якой мы зараз святкуем, перада мной узнікла пытанне аб павышэнні кваліфікацыі. Велізарныя задачы, якія стаяць перад нашай авіяцыяй, патрабуюць ад камандзіра вялікага запасу ведаў, вялікага культурнага багажу. Я паступіў у Вышэйшую ваенна - паветраную акадэмію імя Жукоўскага слухачом першага курса.

Павінен прызнацца, што спачатку прышлося тугавата. Занадта вялікі быў у мяне перапынак у вучобе пасля сканчэння дзевяцігодкі. Але, прыклаўшы ўсе сілы, я выраўняўся, і цяпер не адстаю ад сваіх таварышоў.

# Гераічная гадавіна

Чэлюскінская эпапея ў лютым-красавіку мінулага года прыцягнула ўвагу не толькі рабочых і калгаснікаў совецкай краіны, але і найшырэйшых працоўных мас усяго свету. Лагер Шмідта на дрэйфуючай ільдзіне ў далёкім Чукоцкім моры быў на працягу двух месяцаў цэнтрам падзей, па значэнню далёка выходзячых за межы нашай радзімы.

Сотня чэлюскінцаў, сотня совецкіх грамадзян пасля трагічнай гібелі карабля, раздушанага ільда-

...тоўваць чэлюскінцаў. Бліжэйшы саратнік тав. **Сталіна,** зараз нябожчык тав. **Куйбышэў,** узначаліў урадавую камісію па выратаванню. Усю работу па выратаванню чэлюскінцаў накіроўваў сам таварыш **Сталін.**

На слаўных лётчыкаў урад усклаў ганаровую і надзвычай цяжкую задачу. Скрозь пургу, завіруху, у жорсткія марозы і туманы, без падрыхтаваных пасадачных пляцовак ляцелі героі-лётчыкі і бортмеханікі. Рызыкуючы жыц...

